сал, что посылку получил. Вялікае вам дзякуй за яе. Вельмі ужо роскошная яна. Лепей паскрамней, любые. Глядзеце сябе. Анечка, я хацел бы подарок сделать детям за отличную учебу и просил бы тебя тот кусок шерстяной материи, который ты купила была мне на костюм, употребить для детей. Сшей костюм Лорочке, ведь она уже большая, а Лялечке купи от моего имени тоже костюмчик. Любые мои, вучэцеся, старайцеся, будьте и в этом году отличницами, как в прошлом. В этом моя радость и мое счастье. Бывайте здоровы. Моцна цалую Вас.

Ваш *Адам*.

## № 140. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*19.VIII.38 г.*

День добры, дорогие и любые мои Анечка, Лорочка и Лялечка!

Пишу ужо третью паштовку, як атрымаў посылку, каб паведамиць Вас пра свае здоровье и выказаць Вам вяликае дзякуй за посылку. Адчуваю я сябе добра. Недамаганьн[и] маи ужо праходяць памаленьку. У легких моих ничога сурьёзнага нет. Кровохарканьне зьменшаецца, гэта магчыма ад прастуды. Фурункулы вот яшчэ не праходяць. Няма пивных дрожжей. Кали будеце гатаваць наступную посылку, прышлеце пивных дражжей, фитину, вазелину, глицерину, кали можна, добра было [б] рыбьего жыру, пилорыну. З прадуктаў тут нехват тлушчаў да цукру — гэта асноўнае. Часнок (або выцяжка з яго — алилсат) таксама вельмі тут патрэбна. Любые мае, не хвалюйцеся за мяне. Пераношу ўсё бадзёра. Ад Вас листоў яшчэ не атрымаў ни водного. Бывайце здоровы. Моцна–моцна цалую Вас.

Ваш *татачка Адам*.

## № 141. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*25.VIII.38 г.*

Дзень добры, дарагія и любыя маі Анечка, Лорачка и Лялечка!

Да гэтага часу ад Вас не атрымаў яшчэ ніводнага ліста. Ня ведаю, у чым справа. Ня думаю, каб Вы ня пісалі. Ці здаровы Вы? Ці здароў Ігнась і мама? Ці атрымалі Вы мае паштоўкі (іх я напісаў 3, як атрымаў пасылку). Я здароў. Пакрысе недамаганьні мае праходзяць. Кровахарканьне спынілася. Гэта была часовая зьява. Лёгкія зусім у парадку. Рукі таксама папраўляюцца. Ужо не баляць, як раней. Вот яшчэ толькі з твару не пасходзілі прышчы да фурункулы. Спадзяюся, што хутка і гэта пройдзе. Працую на агульных работах. Адчуваю сябе добра. Нормы выконваю. Спадзяюся, як кончым пабудову дарогі, быць дома. Выбачайце за нязграбнасьць лістоў. Няма часу і нязручна без стала пісаць. Адказу на заяву аб пабачэньні з табою, Анечка, да гэтага часу няма. Прыдзецца чакаць да наступнага лета. Бывайце здаровы. Цалую Вас моцна–моцна. Ваш

*татачка Адам*.